## Тэма нумару: ВЫПУСК 2006 года

**Кантактныя тэлефоны выпускнікоў шукайце на развароце.**

стар. 4-5

Факультэт біялогіі і экалогіі ГрДзУ імя Янкі Купалы

# Pro Nobis*

Першая экалагічная газета | №3(7) | ЛЕТА 2006 | Распаўсюджваецца бясплатна

## Сёння выпускны баль

**Студэнты факультэта біялогіі і экалогіі набору 2001 года афіцыйна скончаць вучобу 29 чэрвеня і а 17-ай гадзіне ў 201 аўдыторыі свайго корпусу ўрачыста атрымаюць дыпломы вышэйшай адукацыі.**

Выпускнікі плануюць весела і запамінальна адсвяткаваць свой апошні вечар. Дзе-



«Гэты вечар не абыдзецца без келіха добрага віна»

ля гэтага пасля афіцыйнай часткі на спецыяльна замоўленым аўтобусе яны накіруюцца спачатку на помныя мясціны Горадні, а потым у начны клуб "Парламент", дзе ўжо забраніраваныя месцы для студэнтаў і выкладчыкаў факультэта.

Аб тым, як святкавалі выпускны раней, чытайце на стар. 7.

Выпускнікі з "Pro Nobis"

## Слізкія прыступкі ганаровага подыюму

**Навуковая канферэнцыя біёлагаў пасля трохдзённай рэпетыцыі абароны дыпломаў скончылася ў чацвер 25 траўня ўзнагароджваннем найлепшых прац; урачыстасць адбылася ў актавай залі біялагічнага корпуса.**



На подыюме месца знайшлося не для ўсіх. Сярод студэнтаў біёлагаў пятага курса, што прадстаўлялі прэзентацыі сваіх дыпломных праектаў, толькі ў групы біяхімікаў атрымаўся паўнавартасны, з трыма прыступкамі, п'едэстал. Першае месца заняла Алена Багушэвіч. На другім і трэцім месцы размясціліся Паліна Кірвель і Аляксандр Апарын адпаведна. У заолагаў было на адну прыступку менш: першае месца –Віталій Лукін, другое – Марына Лявіцкая. У батанікаў выйшаў не п'едэстал, а стоўб. Пачэснае месца на ім заняла Кацярына Краўчык, што даследавала род Ружа на тэрыторыі Горадні.

Па звестках нашай крыніцы, дэкан факультэта Мінюк Г.Я., маючы на ўвазе "непадыходзячы" для ўзнагародаў студэнтаў, сказала: "Пакуль я дэкан на гэтым факультэце, усё будзе па-мойму. Яны ад мяне нічога не атрымаюць".

Ад кожнай групы выкладчыкамі кафедр былі прадстаўлены па тры дастойныя кандыдаты. Аднак дэкан узгадніла прозвішчы толькі тых людзей, што не былі заўважаны ў "непажаданай" дзейнасці. Узнагароджаныя былі студэнты, што не паставілі (ці адазвалі) свой подпіс пад сумназнакамітым лістом у абарону дзяўчын, што атрымалі двойкі на дзяржаўным іспыце.

"Я спадзявалася на прызавое месца, бо аднагрупнікі называлі маю працу дастойнай", - каментуе вынікі адна з "няўгодных" студэнтак.

Такім чынам, вынікае, што на нашым факультэце асабістае стаўленне да студэнтаў з боку кіраўніцтва важнейшае за іх навуковую вартасць.

Чаго чакаць наступным пакаленням студэнтаў? Чаго асцерагацца? Якія ўласныя думкі і дзеянні будуць лічыцца "непажаданымі"?

В.С.

*Pro Nobis (c) - lat. Для Нас

# Няспраўджаныя прагнозы

**Абарона дыпломных праектаў прайшла на факультэце біялогіі і экалогіі з 14 па 23 чэрвеня надзіва паспяхова, але не для ўсіх.**

Дзяўчынам, што не здалі дзярж іспыт, абараняцца не дазволілі. Усе астатнія працы экзаменацыйная камісія ацаніла на "добра" і "выдатна". Самыя яскравыя з дадатных эмоцыяў выражаліся ў падзяцы Валько В. за працу аб шматгадовых таполях і просьбе абавязкова апублікаваць яе. З негатыўных - у папроку Паўловіч Н.В. у бок заолагаў падчас падвядзення вынікаў абароны.

"Абарона паказала, што многія з вас былі вельмі ўпэўнены ў значнасці сваёй работы. А дарма. Вашыя амбіцыі не адпавядаюць вашым заслугам. Канешне, не вы ў гэтым вінаватыя. Прычына ў тым, што некаторыя навуковыя кіраўнікі запэўнілі вас у перавазе вашага дыплома", – сказала Наталля Васільеўна.

Гэтым разам навука перамагла "паддыванныя" спрэчкі, якія ўсё ж змаглі прасачыцца з-пад яе "тынкоўкі" і азмрочыць урачыстасць.

Страхі і прагнозы не спраўдзіліся. Калі памятаеце, у заключны



Прэзентаваць свой дыпломны праект можна было праз ноўтбук

дзень канферэнцыі-перадабароны на ўсе прызавыя месцы не хапіла студэнтаў – з 12 запланаваных было прысвоена толькі 9. Прычыны былі патлумачаны вельмі цмяна. Мяркуючы па выніках "рэпетыцыі", на "прэм'еры" можна было б чакаць куды больш нізкіх адзнак, чым былі прастаўленыя на самой справе.

Пяцікурснікі афіцыйна скончылі сваё навучанне ва універсітэце. Наперадзе выпускны, апошняе вольнае, "беспрацоўнае" лета, поўнае настальгіі, а потым цяжкі шлях да права звацца сапраўдным чалавекам.

**Вольга Сташко**

## Ад рэдакцыі

Неўзабаве мінула пяць год жыцця. За гэты час мы павінны былі стаць спецыялістамі ў абранай галіне. Якімі прафесіяналамі мы будзем, пакажа будучыня – ужо зусім недалёкая. Якімі людзьмі мы сталі збольшага бачна ўжо цяпер. Канешне пасталелі, пасуровелі.

Пяць год таму ўсё бачылася ў больш-менш ружовых колерах; верылася ў дабро, справядлівасць і праўду. Пасля універсітэцкай загартоўкі адценні пабляклі, зрок і слых сталі больш вострымі. Часам на ўласныя вочы бачыш, як знаёмае, здавалася б такое добразычлівае, чалавечае аблічча ператвараецца ў змяіную галаву, а з размовы нельга разабраць анічога акрамя злоснага шыпення. Несправядлівасць, хлусня і падхалімства ва універсітэце сустракаліся неаднойчы.

Але вера ў чалавека і ягоную праўду, у свабоду самабытнай, разнастайнай, творчай асобы ў нас засталася. На гэтую веру і будзьма абапірацца ў далейшым жорсткім жыцці.

# У Свіслач за знаходкамі

**З 15 па 23 чэрвеня на базе Свіслацкай гімназіі №1 імя К. Каліноўскага адбыўся даследчы летнік "Румлёва".**

Паводле "Свіслацкай газеты" у ім прынялі ўдзел каля 30 школьнікаў ліцэю №1 і гімназіі №1 г. Гродна, а таксама гімназіі №1 г. Свіслач. Кіраўніцтва экспедыцыяй узялі на свае плечы гродзенскі краязнаўца Алесь Госцеў, біёлагі Віктар Бахараў і Віталь Гуменны, гісторык Віталь Карнялюк. Зыходзячы з гэтага, вывучэнне Свіслацкага краю (в. Занкі, в. Грынкі, выток ракі Свіслач і інш.) вялося ў двух накірунках: гістарычна-этнаграфічным – пошук мясцовых легенд, паданняў, дыялектаў, старых рэчаў, і ў біялагічным – вывучэнне відавога жывёльнага складу палёў, лясоў, балот і азёр.

"Заўсёды вельмі прыемна чытаць і чуць пра сваіх выкладчыкаў. Не выключэнне і выпадак з летнікам "Румлёва", дзе браў удзел наш (у мінулым) выкладчык В. Бахараў", – кажуць студэнты факультэта біялогіі і экалогіі.

Правядзенне падобных летнікаў – выдатная справа, якая яднае людзей, збірае карысны матэрыял і, адначасова, дае магчымасць адпачыць ад надакучлівых хатніх пакояў і аўдыторый.



Віктар Бахараў - яшчэ са студэнтамі біяфака ГрДзУ

Нагадаем, што В. Бахараў некалькі год таму выкладаў на біяфаку ў г. Гродна, дзе разам з "PRO NOBIS" ладзіў экскурсіі, а ў цяперашні час працуе ў Мозырскім універсітэце.

Наперадзе яшчэ два летніх месяцы, будзем спадзявацца, што яны не пройдуць дарэмна.

**Гелена Белязюн**

*Pro Nobis (c) - lat. Для Нас

# Pro Nobis больш не універсітэцкі

*Круглы стол у рэдакцыі “Pro Nobis”*

**Круглы стол у рэдакцыі “Pro Nobis” адбыўся ў сярэдзіне чэрвеня. У ім узялі ўдзел сябры аднаіменнага экалагічнага руху і адначасова прадстаўнікі рэдакцыі.**



Падчас гутаркі былі і несур’ёзныя моманты

***Ці з’явіліся нейкія новыя тэндэнцыі на факультэце пасля стварэння экалагічнага валанцерскага руху “Pro Nobis”?***

**Віктар Валько:** Натуральна, так. Маладыя актыўныя людзі факультэта згуртаваліся вакол адной ідэі: падвышэнне экалагічнай культуры грамадскасці праз асабістае самаўдасканальванне ў гэтай сферы. Акрамя таго, абвяшчэнне аб нейкай дзейнасці на факультэце біялогіі і экалогіі падняло яго ўзровень у вачах іншых студэнтаў універсітэта. І галоўнае – мы знайшлі цудоўных сяброў на ўсё жыццё.

**Гелена Белязюн:** Дзейнасць “Pro Nobis” на біяфаку прывяла да ўзмацнення супрацоўніцтва паміж студэнтамі і выкладчыкамі ў розных напрамках: дапамога ў пошуках інфармацыі, зварот да самых актуальных тэм, праблем, пытанняў, атрыманне карысных парад.

***Пералічыце канкрэтныя вынікі вашае дзейнасці за перыяд існавання.***

**ВВ:** Правядзенне экалагічных акцый на розныя тэмы з рознымі людзьмі.

Стварэнне асабістай друкаванай прадукцыі – газеты “Pro Nobis”.

Праца са школьнікамі.

Падрыхтоўка сумесна з Юрыдычнай школай дакументаў для афіцыйнае рэгістрацыі руху.

Стварэнне на базе і з дапамогаю руху дыпломнага праекта аб шматгадовых дрэвах Гродзеншчыны.

**ГБ:** За тры гады “Pro Nobis” набыў выдатнага рэдактара, вярстальшчыка, журналістаў і карыкатурыста.

***Што будзе з “Pro Nobis” у будучыні? Якія планы на далей?***

**ГБ:** Я лічу, што мы павінны далей развіваць і працягваць працаваць над тым, што стварылі ў студэнцкія гады. А таксама далучаць да гэтага другіх зацікаўленных людзей.

**Вольга Сташко:** Так, я цалкам згодная з Геленаю. Тым больш, што змена дзейнасці дазволіць нам пашырыць кола інтарэсаў і магчымасцяў. Ужо ёсць спецыялісты, што згодныя супрацоўнічаць з газетай у будучым. Кавалеўская Л.В. ласкава згадзілася весці метадычную калонку, дзе маладыя настаўнікі знойдуць шмат карыснага для працы.

**ВВ:** У сценах ГрДзУ “Pro Nobis” больш не будзе існаваць. Але тут застанецца газета, якую працягнем распаўсюджваць.

***Дзякуючы чаму “Pro Nobis” застаўся “Pro Nobis”, нягледзечы на ўсе факультэцкія і жыццёвыя складанасці?***

**ВС:** “Pro Nobis” ёсць таму, што людзі, якія яго заснавалі, шчыра вераць у сваю ідэю, а ў іх, у сваю чаргу, ёсць сябры, што з той жа шчырасцю і верай ім дапамагаюць.

## Да круглага стала

1 - Станоўча ставяцца да дзейнасці “Pro Nobis”.
2 - Чытаюць газету “Pro Nobis”.
3 - Удзельнічалі ў акцыях “Pro Nobis”.




**Вольга Сташко:** Вынікі апытання студэнтаў наконт адносінаў да руху і газеты “Pro Nobis” (што мы правялі), як мне падаецца, цалкам адпавядаюць пашыраным уяўленням аб беларускім менталітэце. Станоўча ставяцца да экалагічнай дзейнасці 100 % рэспандэнтаў. Гэта не вымагае звышвысілкаў. Як толькі справа даходзіць да больш канкрэтных дзеянняў, запал істотна згасае – у экалагічных акцыях, арганізаваных намі, удзел прымалі толькі 25 %. Ну, і канешне, беларускія студэнты не былі б беларускімі, каб не цягнуліся да друкаванага слова. Нашаму чалавеку можа не хапаць хлеба, але без слова праўды не пражыць аніяк. Хачу спадзявацца, што такія настроі яшчэ захаваліся ў сучасным грамадстве з часоў “Мужыцкай праўды” Каліноўскага. Не раўнуючыся на Кастуся, усё ж прыемна адзначыць, што пытанне наконт газеты вызвала найбольшае шматслоўе з боку апытаных. Падабаецца газета ўсім; 50 % нават далі разгорнутыя адказы. Сярод іх пажаданні поспеху, парады і падзякі. Такім чынам, можна сказаць, што да беларускай душы нашых студэнтаў мы знайшлі сцежку.

*Pro Nobis (c) - lat. Для Нас

# ВЫПУСК - 2006

## Страты, змены, набыткі

**Час не стаіць на месцы. Як кажуць, мяняецца ўсё, нават камяні. Біяфак намагаецца паспяваць за рухам дзён.**

За тэрмін нашай вучобы на факультэце адбыліся падзеі, якія ў большай ці меншай ступені заслугоўваюць увагі.

### Страты

Здавалася б, яшчэ так нядоўга пражылі самі, а ўжо паспелі страціць блізкіх і знаёмых людзей. Буяк Аляксандр Васільевіч, Мазурчык Віталь, Дзенісенка Валянцін Аляксандравіч... Кожны з іх – АСОБА. Кожны – ЧАЛАВЕК. Шануем вашую памяць...

У Мозырскі універсітэт сыйшоў выкладаць Бахараў Віктар Аляксандравіч.

### Духоўныя набыткі

Студэнты нашага выпуска прынеслі даволі шмат новага ў культурнае жыццё факультэта. Гэта і гульні факультэцкага клуба "Што? Дзе? Калі?", і фотавыставы, і экалагічны рух "Pro Nobis" з аднайменнай газетай. Каманда КВК "Біяхазард" у 2001 годзе,папоўніўшыся новай маладой крывёю першакурснікаў, заваявала універсітэцкі кубак. Гэтае дасягненне ёй ўдалося паўтарыць, калі былыя першакурснікі, так бы мовіць, набраліся моцы і на чацвёртым курсе – у 2005 годзе – самастойна падцвердзілі сваю годнасць у пытаннях гумару.



### Паляпшаем быт

Адміністрацыя факультэта найбольш шчыруе на ніве матэрыяльнага дабрабыту і паляпшэння ўмоваў навучання. За час нашага прыбывання ў сценах alma mater, на новыя змяніліся яе ўваходныя дзверы, былі капітальна адрамантаваныя некалькі аўдыторыяў, у адной з якіх з'явіліся нават акварыюмы з гупі. Аднак колькасць лекцыйных часоў у падвальных памяшканнях не скарацілася, тым самым не паменшыўшы канцэнтрацыі радону, што працягвае збірацца ў гэтых памяшканнях, бо кандыцыянеры не ўсталявалі. Затое з'явіліся камеры назірання ў вестыбюлі корпуса.

### Тэндэнцыі

Чым бліжэй да пятага курса, тым усё больш эксперыментаў над студэнтамі. Нашаму выпуску яшчэ так-сяк пашанцавала, а вось нашыя паслядоўнікі заблыталіся ў тых званнях і ўменнях, што могуць атрымаць пасля сканчэння вучобы – ці-то бакалаўр пасля 4 год навучання, ці-то "спецыяліст шырокага профілю"пасля 5 год. Па экспаненце змяняўся "градус накала" у стаўленні да незалежных уласных думак і пазыцый. А, магчыма, бліжэй да выпуску мы проста сталі больш галасна іх выказваць. Па ўсім мяркуючы, паляпшэняў да верасня-2006 не чакаецца.

**В.С.**

## Негатыў і пазітыў студэнцкага жыцця

**Вольга Сташко:**

"Самым прыемным з універсітэцкага жыцця, акрамя набыцця сапраўдных сяброў, было адкрыццё цікавасці да навукі і пачуццё самастойнасці выбару шляху ва ўласным жыцці. Нарэшце ты сам сабе гаспадар.

Самым адмоўным было жаданне некаторых людзей прыдушыць гэтую прагу да самастойнасці і навязаць "школьны" тып навучання, калі за цябе ўсё вырашаюць іншыя. Яшчэ было вельмі непрыемна ўпершыню сустрэцца з сапраўднай подласцю і ліслівасцю. Самае прыкрае тое, што гэтыя якасці ўласцівыя для студэнцкай моладзі."

**Наталля Ламаска і Гелена Белязюн:**

"Самае прыемнае – гэта першая перамога каманды КВК "Біяхазард" у 2001 годзе. Прыемна адчуваць гонар за свой факультэт, нават вучыцца на ім хочацца.

Добрыя ўспаміны пра адзіную канферэнцыю на факультэце ў 2004 годзе.

Непрыемнае тое, што ўсю "праўду" пра сябе мы ўрэшце рэшт даведаліся толькі напрыканцы пятага курса.

Непрыемна было расчаравацца ў людзях, з якімі правёў амаль усе студэнцкія гады."

# ПАЖАДАННІ АД ВЫКЛАДЧЫКАЎ



**Туманаў Веніямін Мікіціч:**

“Жадаю ўсім, каб былі запатрабаваныя як на працы, так і ў жыцці. Але памятайце, што акрамя прафесійнай дзейнасці ёсць яшчэ шмат цікавага і карыснага. Напрыклад, прыносіць людзям радасць.”



**Янчурэвіч Вольга Віктараўна:**

“Жадаю кожнаму знайсці свой жыццёвы шлях, а на ім сустрэць сваю другую палову. Займацца той справай, якая вам па душы. І яшчэ, каб заўсёды вашыя жаданні супадалі з вашымі магчымасцямі!”



**Рыжая Аляксандра Васільеўна:**

“Жадаю, каб у вас усё склалася: каб павыходзілі замуж і ажаніліся так, як гэтага хочаце; каб праца прыносіла задавальненне; каб цяжкасці, якія вы сустрэлі на факультэце, былі б самымі вялікімі цяжкасцямі ў вашым жыцці. Вы мой самы любімы курс!”



**Кавалеўская Людміла Вячаславаўна:**

“У прафесійнай дзейнасці кіравацца дэвізам: “Я – бліскучы настаўнік і ў мяне – цудоўныя вучні!” Памятайце, што нават у самым ад’яўленым сарванцы трэба знаходзіць добрае зярнятка і прарошчваць яго. А ў жыцці, якое з’яўляецца найгалоўнейшым экзаменам, зычу выцягваць толькі тыя білеты, на якія вы ведаеце аптымальны адказ.”



**Бялова Екацярына Аляксандраўна:**

“Няхай у вас наперадзе будзе шмат магчымасцяў, якія вы зможаце рэалізаваць. Выкарыстоўвайце той вопыт, што набылі падчас вучобы: і прафесійны і жыццёвы. Нават калі не ўсё ў вас будзе так, як запланавалі, не апускайце рукі, а намагайцеся дасягнуць светлай мэты.”



**Канунікава Ніна Паўлаўна:**

“Выпускнікі! Па-першае, жадаю, каб атрыманыя вамі ва універсітэце веды спатрэбіліся ў жыцці. Пэўную базу за час навучання вы атрымалі, але на гэтым не трэба спыняцца, таму што сучаснае жыццё проста патрабуе вучыцца чаму-небудзь далей. Па-другое, ніколі не апускайце рукі і не “кісніце”. Ведайце, што той, хто не хоча працаваць, заўсёды шукае прычыны, а той, хто хоча, думае, як стварыць умовы для гэтай працы. І, па-трэцяе, не засяроджвайцеся на асабістых скаргах і крыўдах.

*Ад студэнтаў*

Выказваем шчырую падзяку за цяжкую працу на нашую карысць усім выкладчыкам факультэта. Асабліваю – за “сапраўдную любоў да сваіх чытачоў” - бібліятэкарцы факультэта біялогіі і экалогіі Мінішавай Галіне Міхайлаўне.

**Удзячныя выпускнікі.**



**Для Вас!**

*Pro Nobis (c) - lat. Для Нас

# Не чапай вужоў, і яны не зачэпяць

*Гелена Белязюн*



**"На хутары, у рове, дзе расла маліна, вадзіліся вужы. Яны не чапалі жыхароў хутара. У вужоў была гадзюка-маці. Гаспадар забіў яе. У гэту ж ноч вужы з'елі гаспадарскую карову. Потым з'елі трох свіней. У калодзеж напусцілі яду. Тры гады людзі жылі і мучыліся. Хутар разарыўся, і ўся сям'я пераехала на новае месца. Не чапай вужоў, і яны цябе не зачэпяць". Так распавядае адна з легенд, захаваных ў памяці жыхароў Беларусі.**

І гэта нездарма: паганскае мінулае нашых продкаў сведчыць аб асаблівым стаўленні да вужоў і гадзюк. Асаблівасць гэтая вызначаецца хтоначным паходжаннем змей (з глебы, змочанай апладняльным даждэом), іх каварствам, здрадай, уменнем дзейнічаць знянацку, здольнасцю ўздзейнічаць на лёсы людзей: аддзячваць і караць, узнагароджваць і мілаваць. Легенды з Палесся распавядаюць аб тым, што ў балотах жывуць чэрці і іншыя нячыстыя істоты, а розныя сарокі, вароны і гады ім прыслужваюць, чым выслужваюць для сябе вялікую пашану.

Злосныя дзеянні вужоў і гадзюк, у большасці, накіраваны супраць чалавека, нават супраць таго, хто толькі што выратаваў іх ад вернай смерці. Такая сцэна сустракаецца ў беларускай народнай казцы "Як



Змеі сустракаюцца і сярод людзей

чалавек вужа выратаваў":

"Ідзе сабе чалавек дарогай, паглядвае, бачыць, вуж пад каменем прывалены, толькі галава наверсе круціцца, і не можа вылезці. Як убачыў чалавека, так і кажа:

– Вызвалі мяне, чалавеча, адсюль!

Чалавек злітасціўся над ім, падсадзіў кол пад камень, прыпадняў, і вуж вылез. Ідзе чалавек далей па дарозе, чуе нешта прахладнае на шыі, памацаў – а гэта вуж абкруціўся вакол шыі!

Пытаецца ў яго:

– А гэта што?

– А я табе заплачу так: ты мяне выратаваў, а я цябе задушу..."

На жаль, вужы і гадзюкі сустракаюцца не толькі ў казках, паве'рях і легендах, а існуюць і ў рэальным жыцці сярод людзей. Таму шчаслівы той чалавек, якому лёс падараваў магчымасць іх не зачапіць!

# Цікаўнасці нашых выкладчыкаў



Созінаў Алег Віктаравіч

**"Мае зацікаўленасць і прафесійная дзейнасць супадаюць – гэта геабатаніка і фларыстыка.** Для тых, каму гэта неабыякава, магу параіць набрацца трываласці і нават упартасці. Каб паспяхова займацца гэтай справай, неабходныя: ўменне працаваць у "полі", інтэлект, творчы падыход і адсутнасць страху перад невядомым. Парада на жыццё: будуйце яго па законах эвалюцыі, і тады яно вас не зломіць. Заўсёды імкніцеся да максімума – гэтым забяспечыце неабходны мінімум".



Лучко Валянцін Станіслававіч

**Інтарэс Валянціна Станіслававіча – пчалярства.** На яго меркаванне, таму, хто захоча разводзіць сваіх пчолаў, неабходна быць спецыялістам-біёлагам, да справы ставіцца сур'ёзна і любіць жывое. За рэцэптамі, звязанымі з мёдам, Валянцін Станіслававіч параіў звярнуцца да спецыяльнай літаратуры, а вось свае сакрэты выдаваць не пажадаў.



Бялова Екацярына Аляксандраўна

**"Я вельмі люблю прыроду.** Найлепшы адпачынак для мяне – у яе асяроддзі. Калі вы часам стамляецеся ад людзей – імкніцеся на прыроду. Дапамагае".

*Pro Nobis (c) - lat. Для Нас

# Выпускны часоў Скарыны

Вольга Сташко





Віленская alma mater, год адкрыцця - 1579

*Вучыся, нябожа,*
*вучэнне паможа*
*Змагацца з нядоляй,*
*з няволяй.*
**Невядомы аўтар**

Калі ўлічваць час стварэння першага універсітэта на Беларусі – у 1579 годзе Віленскай alma mater быў прысвоены статус вышэйшай навучальнай установы– можна меркаваць, што святкаванне заканчэння вучобы мае багатую гісторыю.

Цікава было б дакладна даведацца, як адзначалі гэтую ўрачыстасць нашыя продкі, што ў той час насілі ганаровае званне студэнтаў.

## Афіцыёз

Што тычыцца афіцыйнай часткі, Уладзімер Арлоў у сваёй кнізе “Таямніцы Полацкай гісторыі” гэтак апісвае выпускныя дні навучэнцаў Полацкага езуіцкага калегіюма, які пачаў сваё існаванне 2 ліпеня 1580 года: “ У езуіцкіх школах вакацыі пачыналіся звычайна першага жніўня... У той дзень Полацк мог быць сталіцаю ўсёй Белай Русі; шум і грукат вазоў адзываўся па ўсім горадзе; адны ехалі на ўрачыстасці ў дзень святога Ігнація Лаёлы; другія – каб падзякаваць за турботы тым, хто выхоўваў іх дзяцей, іншыя – “каб пабыць у тэатры”, бо вучні рыхтавалі да гэтых дзён пастаноўку...” Дарэчы, званне універсітэта полацкай навучальнай установе надаў Аляксандр I 12 студзеня 1812 года. Але калегіюм з самага свайго пачатку адрозніваўся ад універсітэта, бадай, толькі тым, што не меў яго аўтаноміі ды права прысуджаць навуковыя ступені.

## Свята маладых

Цікавейшай з кропкі гледжання студэнцкай моладзі ўсіх часоў падаецца ўжо больш вольная ад афіцыёзу і залішняй пыхі другая частка святкаванняў. Не заглядваючы, пакуль што, далей за пакаленне нашых бацькоў, можна з упэўненасцю сказаць, што іхнія выпускныя нічым не адрозніваліся ад нашых. Ну, хіба толькі песнямі, пад якія танчылі на вечарыне. Мая маці расказала яшчэ аб тым, што яны ў свой час “абмывалі” выдадзеныя ім значкі аб вышэйшай адукацыі, зусім як генералы свае новыя медалі.



Францыск Скарына, выпуск - 1512 г

Звяртаючыся ж да больш старажытных часоў, мы можам даведацца ад У. Арлова, што вечар 9 лістапада 1512 года для аднаго з выпускнікоў Падуанскага універсітэта таксама “не абышоўся без келіха добрага віна”. Гэтым “маладым спецыялістам” быў Францішак Скарына. Вось толькі, застаўшыся сам-насам з сабою, беларускі асветнік думаў аб тым, “дзе тыя “броні духоўныя”, што ўмацуюць веру народа ў самога сябе”. За народ балела ягоная душа. Затое галава была наранак здароваю.

Мабыць, ад скарыніных часоў святкаванні атрымання дыплома універсітэта ў асноўным мала ў чым змяніліся. Думаю, што адбыліся некаторыя перамены ў такіх рэчах, як градус, колькасць і назва напояў, дзякуючы якім становіцца не так горка ад разумення, што ты ўжо не студэнт.

Спадзяюся, што нашыя выпускнікі не будуць моцна засмучацца. Хочацца верыць, што большасць маладых людзей бачаць наперадзе перад сабой шлях не менш шырокі, слаўны і карысны для Бацькаўшчыны, чым быў у нашага славутага суайчынніка.

*Pro Nobis (c) - lat. Для Нас

# Дзе варта быць гэтым летам

**Летнікі**

Аб'яднанне "Гісторыка" плануе два летнікі. Першы – з 22 ліпеня па 13 жніўня пад Івянцом, дзе будуць праводзіцца аварыйныя працы на месцы колішняй сядзібы XVIII ст. Другі адбудзецца 15 – 27 жніўня ў Любчы пад патранажам кіраўніка Фонду "Любчанскі замак" Івана Пячанскага. Мяркуецца пабудаваць паўтараметровы мур паміж дзвюма адноўленымі вежамі. Маецца зацверджаны праект і будматэрыялы, патрэбныя толькі рукі. Па інфармацыю звяртацца па тэлефонах:**755-03-70 і 654-65-59 (Зміцер).**

**Фэсты**

1 ліпеня ў Лідзе адбудзецца свята піва. У праграме – конкурсы, дзіцячыя атракцыёны, выступы зорак беларускай эстрады. Лідскі бровар прапануе ўвесь асартымент сваёй прадукцыі.

1 – 3 ліпеня ў Навагрудку пройдзе IV Фэст сярэднявечнай культуры "Наваградскі замак – 2006".Мае адбыцца рыцарскі турнір, а таксама выступы айчынных ды замежных гуртоў, што выконваюць старадаўнюю музыку.

26 – 27 жніўня ў Лідзе – штогадовы фэстываль "Замак Гедыміна". Удзел прымаюць рыцарскія клубы з Беларусі, Польшчы, Літвы і Расіі.

Свята вольнай беларускай паэзіі пройдзе 8 ліпеня ў наваколлі Дому-музею Янкі Купалы ля вёскі Ляўкі на Аршаншчыне. Даехаць і ад'ехаць з Мінску можна аўтобусам Орша – Копысь, які ад аўтавакзала адыходзіць у 6.30; 10.00; 13.30; 16.30. Ехаць трэба да прыпынка "Музей Янкі Купалы", а там прайсці праз ягоную тэрыторыю ў бок берага ды спусціцца па сходах да Дняпра. Па беразе налева, прайсці каля 500 м да вогнішча. Паблізу можна паставіць намёт.



**Муры Наваградскага замка**

**Паводле "НН" № 21 (475) ад 9 чэрвеня 2006**

# Вяртайцеся

***ФЕЛЬЕТОН ад Віктара В.***

**Калі б з пасады дэкана сышла па ўласнаму жаданню М.Г.Я... Уявім, як рэагавалі б на гэта розныя слаі універсітэцкага насельніцтва.**

Канешне ж, раз'юшаныя жыхары факультэта не маглі б спакойна ігнараваць такое здрадніцтва з боку іхняга куміра, таму вырашылі б ліставаць сваёй "маме" з просьбамі вярнуцца.

Даведаўся аб гэтым падчас адбою ў казарме. Ноч не спаў: як так?.. Вяртайцеся! (салдат пасля 2-га курса).

Дзякуй, што падаравалі нам жыццё. Такія цудоўныя акварыюмы. Мы ж цяпер паздыхаем! Вяртайцеся. Гупі з 129 аўдыторыі.

Нас цяпер, пэўна, згадзяцца рэгістраваць як студэнцкі рух. А мы ж ужо ўсе дакументы папалілі. Вяртайцеся, а то столькі працаваць зноў не хочацца. "Pro Nobis".

Дзе цяпер гаварыць будзем. Тут такая навіна, а ты...Вяртаяйся, ці што. Сяброўка па цэху.

Хто ж цяпер абараняць нас будзе на дзяржіспытах за актыўную абшчэсьцвенную дзейнасць. Грамадскасць у твары мяне патрабуе вяртацца. Абшчэственнік з малодшых курсаў.

Хто нас падтрымліваць будзе падчас гульняў КВЗ. Вы ж так смяяліся... Эх. Каманда КВЗ "Біяхазард".

Ходзяць чуткі, што новы дэкан усталюе кандыцыянеры ў падвальных аўдыторыях. Дзе ж мне цяпер скапляцца будзе? Вяртайцеся. З павагаю, Газ Радон.

Цяпер што, усе лекцыі будуць распісаныя на паўгады? А як жа ж тлумачыць выкладчыкам сваю адсутнасць. Вяртайцеся. У будучым, спадзяюся, зноў студэнт (цяпер салдат пасля 2-га курса).

*У дэканаце*



Факультэт біялогіі і экалогіі ГрДзУ імя Янкі Купалы
Pro Nobis*

Галоўны рэдактар: **Віктар Валько**
**тэл. (маб.): 781 20 98**
Аб'ём: 1 умоўна друкаваны аркуш
Наклад 150 асобнікаў
Выдавец: факультэт біялогіі і экалогіі ГрДзУ
Надрукаваны на абсталяванні выдаўца
Адрас рэдакцыі: вул. Даватара, 3/1
Нумар падпісаны ў друк: 29.06.2006
Вашыя артыкулы вы можаце дасылаць на E-mail:
**pronobis2004@mail.ru**